16+

# Лім

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5202) 11 лістапада 2022 г.

ISSN 0024-4686



Блізкі сучасніку Колас стар. 5



Узвысіць чалавечую годнасць стар. 12



«Харошкі» на хвалі з Купалам стар. 13

# Палітра лістапада




Фота БелТА.

*Падчас адкрыцця фестывалю.*

Апошнім часам у стужцы беларускіх кінанавін запанавала зацішша: цікавых вестак з кожным месяцам меншае. А ўсё ж апладысменты гучаць! На кароткі час Беларусь стала ні многа, ні мала цэнтрам кінамастацтва: гэтымі днямі на экранах нашай краіны — фестывальныя хіты з усяго свету. Амаль паўтары тысячы заявак з 89 краін, каля сотні кінафільмаў у больш чым 30 гарадах і безліч розных мерапрыемстваў... Маршам па кінатэатрах сталіцы і ўсёй рэспублікі прайшоўся XXVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»!

Пачаўшыся з урачыстай цырымоніі адкрыцця і сімвалічнага абраду разбівання талеркі ў мінулую пятніцу, сёння «Лістапад» падводзіць свае вынікі. У 18.00 у сталічным кінатэатры «Масква» — цырымонія закрыцця фестывалю, падчас якой будуць вызначаны фаварыты журы ў чатырох конкурсных праграмах, лаўрэаты спецыяльных узнагарод кінаспаборніцтва, а таксама ўладальнікі прызоў сімпатый гледачоў. Зрэшты, прамежкавыя вынікі падведзены ўжо. Так, яшчэ ў панядзелак завяршыўся конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік».

**Працяг тэмы на стар. 4 ▸**

# «Пакажы мне жыццё...»

**Існуе меркаванне, што інтэрнэт, тэлебачанне канчаткова адвярнулі моладзь ад чытання мастацкай літаратуры. Што ж, у пэўным сэнсе такі момант, на жаль, ёсць, але маюць месца і іншыя прыклады. А менавіта маладыя людзі, якія не толькі чытаюць прозу, паэзію, але спрабуюць і самі ствараць мастацкія творы. І адным з месцаў, дзе збіраюцца такія дзяўчаты і хлопцы, стаў літаратурны клуб «Катарсіс» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Створаны ў 1999 годзе, ён працягвае па сённяшні дзень збіраць пад сваім дахам таленавітую моладзь, дапамагае навучыцца правільна і якасна пісаць вершаваныя, празаічныя і драматургічныя творы. За гэты час выдадзены чатыры калектыўныя літаратурныя зборнікі, будучыя дактары друкаваліся ў газетах «Эскулап», «Гродзенская праўда», «Вячэрні Гродна», часопісе «Маладосць». Пастаянна ўдзельнічаюць у розных літаратурных конкурсах, і досыць паспяхова. А ў апошнім Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «Аўтограф-20» атрымалі ажно 12 дыпломаў пераможцаў і прызёраў, што стала своеасаблівым рэкордам сярод ВНУ краіны. Студэнты прымалі ўдзел у Дні беларускага пісьменства ў Слоніме, V кніжным фестывалі «Гарадзенскі літфэст», часта выступаюць перад універсітэцкімі і школьнымі аўдыторыямі. На працягу 10 гадоў праводзіцца адкрыты літаратурны конкурс клуба «Катарсіс», у якім ахвотна прымаюць удзел аўтары з усіх куткоў Беларусі, а таксама Расіі, Польшчы, Германіі. І зараз мы хацелі б прадставіць вершы некаторых нашых аўтараў.**

**Віктар ВАРАНЕЦ,**
**кіраўнік літаратурнага клуба «Катарсіс»**

## Арцём ПОЛУДЗЕНЬ

### Буслы

*З хваляваннем, з пяшчотаю мілаю*
*(Пачуццё як сваё перадаць?)*
*Назіраю штогод я, як з выраю*
*Зноў буслы на радзіму ляцяць.*

*Вось ляцяць над знаёмай мясцінаю,*
*Над палеткамі водзяць кругі.*
*Зноў спатканне з любімай Радзімаю,*
*Сустракае іх край дарагі.*

*Тут заўжды і паветра духмянае,*
*І бярозавы гай, і лугі,*
*Так знаёмае ўсё і жаданае,*
*Тут няшчасцяў няма і тугі.*

*Клёкат птушак мне песняю шчыраю,*
*З ім не страшны любы перартрус,*
*Калі бусел вяртаецца з выраю,*
*На святую зямлю — Беларусь!*

## Дзіяна ТРАЦЦЯК

### Пакажы мне жыццё

*Пакажы мне жыццё дасканалае,*
*Што чакаем, нібы дару Божага.*
*Што ні разу нікім не зламанае,*
*Не парушана сілай варожаю.*

*Пакажы мне жыццё, таго вартае,*
*Каб пражыць яго і не саромецца*
*Ні прад продкамі, ні прад нашчадкамі*
*За ўсё тое, што намі тут робіцца.*

*Пакажы мне жыццё больш сапраўднае,*
*Чым гайсанне між працай і хатаю.*
*Тэлевізарам не змарнаванае,*
*Не разбітае бутэлькай праклятаю.*

*Ды не зваліцца з неба, як марыце,*
*Ні багацце, ні шчасце, ні рацыя.*
*Бо жыццё — што вы самі ствараеце*
*Сэрцам, розумам, плённаю працаю!*

## Юлія ШАЎКОВІЧ

* * *

*Ты глядзіш у люстэрка з прыкрасцю.*
*Засталося ці што там ад годнасці?*
*За вачэй халоднай блакітнасцю,*
*за чужою нахабнай ісготнасцю,*

*за той моваи, што з вуснаў зрываецца,*
*што таксама не наша, пазычана.*
*Наша з болем душы адгукаецца,*
*бо забыта амаль, абязлічана.*

*Тое дзе, за што продкі змагаліся?*
*І чаму мы ў пекла так гонімся?*
*Хто мы, дзе мы, і што з намі сталася?*
*Ці абудзімся мы, ці апомнімся?*

*Дзе яна, дзе душа беларуская? —*
*Льецца ў сэрца мне матчынай песняю.*
*Б'ецца ў грудзі спалоханай птушкаю.*
*Знічкай белай лунае над безданню.*

*З абраза вочы сочаць у покуці.*
*А патэльня абудзіцца шкваркаю.*
*Смех гучыць у маланкавым грукаце.*
*Нашы беды сплывуць лёгкай хмаркаю.*

*Паглядзім у люстэрка з надзеяю.*
*І без зайздрасці, і без прыкрасці.*
*Беларусы заўжды жылі з вераю,*
*З добрым сэрцам, душэўнаю літасцю.*

## Караліна МАКАВЕЦКАЯ

* * *

*Зямлёй і людзьмі рухае дух змагання.*
У. Караткевіч
«Каласы пад сярпом тваім»

*Стрэлы гучаць, як раскаты грымотаў.*
*Жудасны кліч:*
*«Касінеры, наперад!»*
*У кашулях, пашарпаных ботах*
*Выйшлі біцца за праўду і веру.*

*Зброя сялянская, у страўніках пуста.*
*Гэта не армія, а самагубства.*
*Толькі малітва зрываецца з вуснаў.*
*Смерці баяцца? Сапраўднае глупства.*

*Так збажына не кладзецца ад граду,*
*Як на пабоішчы падаюць людзі:*
*Так дакрануцца хацелі да праўды —*
*Ды на зямлю,*
*на халодныя грудзі…*

*І разбіваюцца горкія лёсы —*
*Слава героям як мужнасці сімвал!*
*Плачуць над імі спрадвечныя сосны,*
*Бой — не гульня,*
*а харугва — не вымпел.*

*Толькі малітва кранаецца вуснаў.*
*Зброя сялянская, ў страўніках пуста.*
*Смерці баяцца —*
*сапраўднае глупства.*
*Подзвіг народа, не самагубства…*

## Лізавета БАЗЫЛЬЧЫК

### Зямля бацькоў

*Люблю зямлю сваіх бацькоў,*
*Яе дубровы і лясы.*
*З паважнай веліччу зуброў*
*І сцежкай, мокрай ад расы.*

*Люблю гаючы смак крыніц,*
*Магутнасць волатаў-дубоў.*
*І павуцінку, што ляціць,*
*І водар восеньскіх грыбоў.*

*Жывуць тут людзі ў дабрыні,*
*Шырокай, шчыраю душой,*
*Зямлі адданыя сыны*
*Маёй Радзімы дарагой!*

## Алена ЛОЎЧАЯ

### Меркаванне

*З узростам прыходзяць веды,*
*А з вопытам — веды душы.*
*Жыццё ж — не кавалак крэйды —*
*Сціраў і зноўку пішы.*

*Малыя прагнуць узросту,*
*Хутчэй каб беглі гады.*
*Здаецца, дарослым быць проста,*
*Праблемна быць маладым…*

*Ва ўсіх ёсць толькі здагадкі,*
*Не ведаем, што далей.*
*Калі ж нас стварылі такімі,*
*Давайце туліцца бліжэй!*

*Хутчэй расчыняйце дзверы,*
*Склікайце ў хату гасцей,*
*Паболей любові і веры —*
*Дарыце для добрых людзей!*

## Таццяна КРУПІЦА

### Беларусь

*Раніцай пахне у полі травою,*
*Нёман лагодную песню пяе.*
*Сонца ўстае над радзімай зямлёю*
*І асвятляе пяшчотна яе.*
*Дзесьці зязюля кукуе ў лесе,*
*Бусел над вёскай лунае маёй.*
*Вецер-гарэза шуміць на Палессі,*
*Белыя чайкі ляцяць над Дзвіной.*
*О Беларусь, дарагая Радзіма,*
*Край незабыўны, табой ганаруся.*
*У сэрцы маім ты каханне адзінае,*
*Слаўная, мілая Белая Русь!*

## Марыя САЛОМКА

### Жнівеньскі вечар

*Пахне чаборам жнівеньскі вечар,*
*Дзесьці камарыкаў чуецца звон.*
*Я так лящела на нашу сустрэчу…*
*Ты прыцягнуў свой любімы айфон.*
*Нам паблукаць бы з табой*
*па сцяжынах,*
*Каб захапіла каханне ў палон.*
*Сядзь жа бліжэй ты да любай*
*дзяўчыны…*
*Не, ён гартае любімы айфон.*
*Вечар той ў памяці не, не сатрэцца:*
*Ён для мяне як апошні патрон.*
*Хай гэты дурань адзін застаецца*
*І пацалуе любімы айфон…*

---



## Тамара ТАЛКАЧОВА

* * *

*Буяюць ля хаты вяргіні,*
*Махрацца вясёлкаю астры,*
*Павоі ўзняліся ў вышыні,*
*Нібыта ў палацах пілястры.*

*Ды гэтая пышная квецень —*
*Штрышок развітальны прыроды*
*Ці мо напамінак аб леце?*
*Пусцеюць сады і гароды...*

*І птушкі сабраліся ў вырай,*
*І лісцейка з дрэў ападае.*
*І восень,*
*з усмешкаю шчырай,*
*Апошнім цяплом нас вітае.*

* * *

*Восень кружыць і кружыць*
*Залатою лістотай*
*Пад акорды няўсцешнай*
*Жураўлінай тугі.*

*Ахінаючы сэрца*
*Няўсцешнай самотай,*
*Запаўняе пяшчотай*
*Душы берагі.*

*І пякучая горыч*
*Пары развітальнай,*
*І гаючая слодыч*
*Загадкавых дзён*

*Разліваецца морам*
*І гукаў, і фарбаў —*
*І гучыць над зямлёю*
*Яе перазвон.*



## Павел КАРАЛЁЎ

* * *

*І ўсё ж Яму не ўсё адно...*
*Не абыякавыя лёсы,*
*І знак дае, ды бярэжэ,*
*І выратоўвае праз слёзы.*
*Здаецца, знікне зніч надзей,*
*Падасца марным бессэнсоўнасць...*
*А хтосьці грукае мацней*
*І сведчыць блізкае — бясконцасць...*

* * *

*Нехта смажыць*
*на патэльні азёр*
*Ранкам летнім*
*У тумане бялюткім...*
*Край чароўны!*
*Ты пакажаш паўнютка*
*Зоры зноў, што народзяць*
*Любоў...*

* * *

*Не свету гэтага*
*трымаецца,*
*А з далечы...*
*Свой шлях ісці,*
*Як сведка той Сустрэчы.*